**Палітычная гісторыя**

**Мікалай СЯМЕНЧЫК**

# Керанскі супраць Карнілава: чыя перамога?



*СЯМЕНЧЫК Мікалай Яфімавіч — загадчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта (БДТУ), доктар гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1953 г. у г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на Мінскай вобл. У 1979 г. закончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Працаваў настаўнікам у Закальнецкай сярэдняй школе Любанскага р-на, сярэдняй школе № 140 г. Мінска. З 1984 г. — у Інстытуце гісторыі АН БССР, з 1988 г. — у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М.Горкага, з 2000 г. — у БДТУ. Даследуе гісторыю партый, прафесійных, нацыянальных арганізацый і рухаў у час Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., перыяду акупацыі Беларусі ў 1918—1920 гг. Аўтар манаграфій "Грамадска-палітычнае жыццё ў Мінску (сакавік—кастрычнік 1917 г.)" (Мн., 1994), "Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 — сакавік 1918 гг.)" (ч. 1—2, Мн., 2001), каля 100 навуковых артыкулаў.*

Перакананне расійскай грамадскасці, што ўзброенае выступленне Вярхоўнага галоўнакамандуючага Л.Г.Карнілава 25—31 жніўня 1917 г.* было спланаванай акцыяй, скіраванай на падаўленне дэмакратычнай рэвалюцыі і ўсталяванне ў Расіі ваеннай дыктатуры, пачало фарміравацца практычна адразу пасля з'яўлення ў друку 27—28 жніўня адпаведных тэлеграм тагачаснага міністра-старшыні Часовага ўрада А.Ф.Керанскага. Наколькі гэта адпавядала рэчаіснасці, спрабавалі высветліць члены Надзвычайнай следчай камісіі Часовага ўрада, але пераканаўчых доказаў існавання змовы не знайшлі. Не было адзінства ў гэтым пытанні і ў асяроддзі рускай эміграцыі — як манархістаў, так і сацыялістаў. Так, прадстаўнік апошніх А.Керанскі ў сваіх успамінах вялікую ўвагу надаваў абгрунтаванню, а дакладней, апраўданню сваіх дзеянняў па выкрыцці і ліквідацыі "генеральскай контррэвалюцыі". Спрэчкі ў навуковых колах замежжа пра існаванне карнілаўскай змовы не спыняліся да канца 1980-х гг.[1].

Што датычыць савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі, то дзякуючы намаганням партыйных гісторыкаў у грамадскай думцы склалася перакананне, што Л.Карнілаў з моманту заняцця пасады Вярхоўнага галоўнакамандуючага 19 ліпеня 1917 г. разам з "рэакцыйнымі коламі буржуазіі" паставіў сабе за мэту ўсталяванне ваеннай (або нават ваенна-тэрарыстычнай) дыктатуры[2].

Наколькі такое сцвярджэнне слаба абгрунтавана фактамі і пацвярджаецца логікай развіцця рэвалюцыі, можна пераканацца, калі аб'ектыўна прааналізаваць падзеі, што адбываліся вясной—летам 1917 г. на Заходнім і Паўночным франтах, а таксама ў Дзвінскай і Мінскай ваенных акругах і ў Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве.

Зазначым, што з перамогай паўстання ў Петраградзе 27 лютага 1917 г. генералітэт і патрыятычна настроенае афіцэрства сваёй асноўнай задачай лічылі не абарону манархіі, а ўтрыманне фронту супраць войскаў Траістага саюза. Пра гэта сведчыць пазіцыя галоўнакамандуючых франтамі па пытаннях мэтазгоднасці адрачэння Мікалая II ад трона, выбару ў Расіі формы праўлення і далейшых задачах арміі. Так, у тэлеграме начальніка штаба Стаўкі М.В.Аляксеева ад 2 сакавіка на адрас войскаў Дзеючай арміі гаварылася: "Армія павінна ўсімі сіламі змагацца са знешнім ворагам, а рашэнні адносна ўнутраных спраў павінны пазбавіць яе ад спакусы ўзяць удзел у перавароце, які бяскроўна здзейсніцца без рашэння зверху"[3]. Адным з матываў адрачэння Мікалая II ад прастола называлася таксама неабходнасць "яднання і згуртавання ўсіх сіл народных для хутчэйшага дасягнення перамогі". Прыкладна такім жа быў і змест загадаў і аб'яў галоўнакамандуючага Заходнім фрон-

* Тут і далей усе даты даюцца па старым стылі (юліянскім календары).



М.Аляксееў.



А.Дзянікін.



А.Керанскі.

там генерала А.Е.Эверта, звернутых да вайскоўцаў і насельніцтва прыфрантавой паласы. 4 сакавіка ў загадзе № 1400 ён адзначаў неабходнасць выгнання ворага за межы "зямлі Рускай" і заваёвы ганаровага міру. А.Эверт патрабаваў захоўваць у войсках строгую дысцыпліну, "не займацца палітыканствам, не марнаваць дарэмна час і нервы на бессэнсоўнае абмеркаванне таго, што адбываецца ў тыле і ва ўнутраным кіраванні Расіі". У той жа дзень галоўнакамандуючы Паўночным фронтам генерал М.У.Рузскі загадаў надрукаваць зварот новага Вярхоўнага галоўнакамандуючага вялікага князя М.М.Раманава з заклікам спакойна чакаць волевыяўлення "рускага народа", як і раней падпарадкоўвацца начальнікам і разам з саюзнікамі змагацца супраць ворага[4]. Генерал А.І.Дзянікін, які быў у той час начальнікам штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага, пісаў: "Я магу адзначыць, што і пазней у свядомасці многіх асоб вышэйшага каманднага саставу, якія ставілі на першы план выратаванне радзімы, у гэтым пытанні меркаванні юрыдычнага, партыйна-палітычнага і дынастычнага характару не адыгрывалі ніякай ролі. Гэта акалічнасць мае вялікае значэнне для засваення многіх наступных з'яў"[5].

У адрозненне ад ваеннага камандавання, якое імкнулася да захавання дысцыпліны, адносіны лідэраў рэвалюцыйных партый (бальшавікоў, эсэраў, анархістаў) да ўзброеных сіл вызначаліся імкненнем да іх дэмакратызацыі і ліквідацыі адзінаўладдзя камандзіраў. Гэта адбілася і на пазіцыі Часовага ўрада, пра што сведчылі загад № 1 ад 1 сакавіка войскам петраградскага гарнізона, а таксама 6-ы і 8-ы пункты Дэкларацыі Часовага ўрада ад 3 сакавіка (аб нявывадзе з Петраграда войскаў, якія ўдзельнічалі ў рэвалюцыі, і аб наданні салдатам роўных з усімі грамадзянамі правоў). Невыпадкова, што ў тых умовах сталічны гарнізон стаў ператварацца ў апору Петраградскага Савета як другой улады, альтэрнатыўнай Часоваму ўраду.

Загады ваеннага і марскога міністра Часовага ўрада А.І.Гучкова аб скасаванні найбольш адыёзных прынцыпаў, што існавалі ў старой арміі, абяцанне распачаць яе рэфармаванне паскорылі працэс палітызацыі і арганізацыйнага разлажэння ў войску. Гэта непакоіла камандаванне і большасць прафесійных вайскоўцаў. Яны разумелі, што ў новых умовах прысяга, вайсковы статут і загад гублялі свой вызначальны фактар у сістэме армейскіх узаемаадносін, якія сталі грунтавацца не на абавязках вайскоўца, а на правах "салдата-грамадзяніна".

Выконваючы абавязкі галоўнакамандуючага Заходнім фронтам генерал У.В.Смірноў, які бачыў асноўны сэнс пераўтварэння ўнутранага жыцця арміі на пачатках узаемнай дамоўленасці і супрацоўніцтва камандзіраў і падначаленых, распарадзіўся ў сярэдзіне сакавіка паскорыць фарміраванне сумесных салдацка-афіцэрскіх грамадскіх арганізацый[6]. Так, у Мінску, дзе размяшчаўся штаб фронту, у лютым 1917 г. былі створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а таксама асобны Савет афіцэрскіх дэпутатаў. Востра стаяла праблема сумеснай працы камандавання, салдат, афіцэраў і дэмакратычных элементаў арміі і тылу для падтрымкі Часовага ўрада. 7—17 красавіка 1917 г. у Мінску прайшоў 1-ы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту, на якім быў абраны Выканаўчы камітэт (Выкамзах) у складзе 75 чалавек. Аднак супрацоўніцтва з камандаваннем не атрымалася, Выкамзах стаў у апазіцыю да яго.

Разам з тым галоўныя ініцыятары дэмакратызацыі арміі ў асобе Петраградскага Савета таксама не здолелі ўтрымаць сітуацыю пад кантролем ні ў тыле, ні на перадавой. Міністр А.Гучкоў пад націскам Петра-

градскага Савета адхіліў ад пасад многіх "ненадзейных" генералаў (М.Аляксеева, Дз.П.Зуева, П.А.Лячыцкага, Е.А.Рауш фон Траўбенберга, М.Рузскага, Н.Е.Туманава, А.Эверта), а падчас красавіцкага крызісу Часовага ўрада сам падаў у адстаўку. 4 мая на нарадзе генералітэта і новага складу Часовага ўрада ў Петраградзе прызначаны Вярхоўным галоўнакамандуючым генерал А.А.Брусілаў выказаў нязгоду з дзейнасцю эмісараў Петраградскага Савета, якія, паводле слоў генерала, стараліся "паглыбіць развал арміі, быццам апасаліся контррэвалюцыі, праваднікам якой можа быць корпус афіцэраў". А.Брусілаў катэгарычна запатрабаваў спыніць цкаванне афіцэраў[7].

Становішча арміі яшчэ больш пагоршылася пасля падпісання 11 мая 1917 г. новым ваенным і марскім міністрам і старшынёй Часовага ўрада А.Керанскім "Дэкларацыі правоў салдата і грамадзяніна", якая значна зніжала статус афіцэра і камандзіра. Спроба галоўнакамандуючага Заходнім фронтам В.І.Гуркі заступіцца за афіцэрскі корпус каштавала яму пасады. Намаганні патрыятычна настроеных афіцэраў стварыць уласныя суполкі накшталт "Саюза афіцэраў", "Ваеннай лігі" і інш. выклікалі пратэсты з боку салдацкіх Саветаў і левых партый. Вярхоўны галоўнакамандуючы А.Брусілаў таксама выказваўся супраць стварэння афіцэрскіх суполак[8].

Пасля сакрушальнага паражэння рускай арміі ў летняй кампаніі 1917 г. на палітычнай арэне ўзнікла асоба камандуючага 8-й арміяй генерала Л.Карнілава. Яго аўтарытэт у ваенных колах значна павялічыўся пасля паспяховага наступлення 8-й арміі, якая ваявала ў складзе Паўднёва-Заходняга фронту. Верагодна, імя генерала стала прыцягальным для "прыхільнікаў моцнай рукі" яшчэ і таму, што ў час красавіцкіх антыўрадавых маніфестацый у Петраградзе ён прапанаваў размясціць дзве артылерыйскія батарэі на Дварцовай плошчы[9]. Пасля правалу летняга наступлення і петраградскіх падзей 3—5 ліпеня пагроза поўнага развалу ўзброеных сіл стала настолькі рэальнай, што прызначэнне генерала Л.Карнілава на пасаду Вярхоўнага галоўнакамандуючага было станоўча ўспрынята большасцю афіцэраў і грамадскасцю (за выключэннем бальшавікоў). І "левыя", і "правыя" ўсвядомілі небяспеку анархіі ў арміі і слабасць Часовага ўрада.

На нарадзе ў Стаўцы 16 ліпеня М.Аляксееў, А.Дзянікін і іншыя генералы прама абвінавацілі "ў разлажэнні арміі таварышаў Керанскага па ўраду — эсэраў і меншавікоў". Нават сам міністр-старшыня "ціснуў руку Дзянікіну, дзякаваў за шчырую і праўдзіва выказаную думку"[10]. Выхадам з цяжкога становішча на нарадзе прызнавалася аднаўленне дысцыпліны ў войску, абмежаванне дзейнасці Саветаў і вайсковых камітэтаў у зоне баявых дзеянняў, яднанне ўсіх партый і арганізацый, зацікаўленых у баяздольнай арміі і моцнай расійскай дзяржаве.

Аналіз дакументаў паказвае, што няма сур'ёзных падстаў лічыць, быццам генералітэт вёў падрыхтоўку да контррэвалюцыйнага перавароту. Па-першае, вышэйшае камандаванне прысягнула на вернасць Часоваму ўраду, выказвала гатоўнасць аказаць яму падтрымку ў аздараўленні ўнутрыпалітычнага клімату ў краіне, аднаўленні баявой моцы арміі і вядзенні вайны да пераможнага канца. Па-другое, да канца лета палітычная і аператыўная дзейнасць Стаўкі і іншых штабоў знаходзілася пад кантролем вайсковых арганізацый, франтавых і армейскіх камісараў Часовага ўрада.

Грамадства, дэмаралізаванае вынікамі летняга наступлення рускай арміі і ўстрывожанае спробай бальшавікоў ажыццявіць захоп улады 3—5 ліпеня ў Петраградзе, выказвалася за ўмацаванне дзяржаўнай улады. Часовы ўрад для кансалідацыі ўсіх палітычных сіл, зацікаўленых у пераадоленні крызісу, абвясціў на 12 жніўня скліканне ў Маскве Дзяржаўнай нарады з удзелам "усіх жывых сіл краіны" — прадстаўнікоў дзяржаўных, вайсковых, партыйных, грамадскіх і іншых структур.

Разам з тым любая спроба ўрада і дэмакратычных партый спыніць анархію ўспрымалася бальшавікамі-ленінцамі як актывізацыя контррэвалюцыі.



*Л.Карнілаў.*

Падрыхтоўка да шырокага дэмакратычнага форуму выклікала з іх боку шалёную кампанію асуджэння. У рэзалюцыі ЦК РСДРП(б) ад 6 жніўня гаварылася, што "Маскоўская нарада, якая прыкрываецца і падтрымліваецца дробнабуржуазнымі партыямі — эсэрамі і меншавікамі, — на справе з'яўляецца змовай супраць рэвалюцыі, супраць народа"[11]. Большасць удзельнікаў нарады, у тым ліку з асяроддзя "рэвалюцыйнай дэмакратыі", выявіла прыхільнасць ідэі "моцнай улады", здольнай аднавіць баяздольнасць арміі, прыпыніць анархію на фронце і ў тыле, вырашыць харчовае і іншыя пытанні. Асаблівую заклапочанасць па ўмацаванні Часовага ўрада выказвалі вайскоўцы. Як заявіў генерал А.М.Каледзін, "раскраданню дзяржаўнай улады цэнтральнымі і мясцовымі камітэтамі і Саветамі павінен быць неадкладна і рэзка пакладзены канец"[12].

Такім чынам, вынікі Дзяржаўнай нарады давалі пэўную надзею на пераадоленне крызісных з'яў, пра што сведчылі шматлікія рэзалюцыі на адрас Часовага ўрада. Так, Выканкам Заходняга фронту пасля абмеркавання спецыяльнага даклада па выніках нарады большасцю галасоў заявіў аб сваім далучэнні да дэкларацыі аб'яднанай дэмакратыі, абвешчанай М.С.Чхеідзе[12].

Неабходнасць нацыянальнай кансалідацыі стала яшчэ больш актуальнай, калі 21 жніўня рускія войскі здалі Рыгу. Стваралася непасрэдная пагроза германскага наступлення на Петраград. Бальшавікі прама пачалі абвінавачваць Часовы ўрад і кіраўніцтва арміі ў падрыхтоўцы контррэвалюцыйнага перавароту. VI з'езд РСДРП(б) (26 ліпеня—3 жніўня 1917 г.) абвясціў курс на ўзброенае паўстанне. Адным з крокаў па выхаду краіны з глыбокага сістэмнага крызісу стала дырэктыва А.Керанскага Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму Л.Карнілаву аб умацаванні петраградскага гарнізона надзейнымі войскамі і адпраўцы на фронт прабальшавіцкіх часцей сталіцы. Не пазней 23 жніўня А.Керанскі праз кіраўніка ваеннага міністэрства Б.В.Савінкава перадаў у Стаўку сваю згоду на перадачу Петраградскай ваеннай акругі ў падпарадкаванне Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму, што давала яму магчымасць правесці перадыслакацыю войскаў у раёне сталіцы. Да гэтага часу камандуючы Петраградскай ваеннай акругай генерал Васількоўскі загадаў адправіць на фронт найбольш рэвалюцыйна настроеныя Маскоўскі, Петраградскі, 180-ы, 1-ы і 176-ы пяхотныя палкі. Генерал Л.Карнілаў аддаў загады генералам А.М.Крымаву і А.М.Далгарукаму, якія 24—25 жніўня распачалі перакідку па чыгунцы 1-й Данской, Усурыйскай коннай, Каўказскай ("Дзікай"), а таксама 5-й казацкай дывізій у напрамку Петраграда. Але ўвечары 27 жніўня дзяржаўнымі, ваеннымі і грамадскімі ўстановамі была атрымана тэлеграма А.Керанскага, дзе паведамлялася пра патрабаванне "былога галоўнакамандуючага генерала Карнілава" аб "неадкладнай перадачы яму дыктатарскай улады над усёй дзяржавай"[14].

Якім чынам у міністра-старшыні Часовага ўрада склалася такое ўражанне і наколькі яно было абгрунтаванае, даследчыкам яшчэ патрэбна высвятляць. Вядома толькі, што 26 жніўня А.Керанскі пасля гутаркі з былым обер-пракурорам Найсвяцейшага сінода першага складу Часовага ўрада У.М.Львовым прыйшоў да высновы, што рух войскаў А.Крымава і А.Далгарукага на Петраград мае не столькі ваенныя, колькі палітычныя мэты, якія пагражаюць існаванню Часовага ўрада. Спробы А.Керанскага высветліць сітуацыю падчас размовы па прамым провадзе з Л.Карнілавым са спасылкамі на У.Львова, магчыма, пераканалі яго ў існаванні змовы. 27 жніўня А.Керанскі загадаў Л.Карнілаву асабіста прыбыць у Петраград. Гэта выклікала ва ўсіх членаў Стаўкі крайнюю занепакоенасць з прычыны магчымага зрыву задуманай вайсковай аперацыі. Вечарам у сталічным друку з'явілася афіцыйнае паведамленне міністра-старшыні з абвінавачаннем Л.Карнілава ў спробе "ўсталяваць дзяржаўны лад, які супярэчыць заваёвам рэвалюцыі", і адхіленнем яго ад пасады Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Петраград абвяшчаўся на ваенным становішчы.

Цэнтральны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Выканкам Савета сялянскіх дэпутатаў на пленарным пасяджэнні ноччу з 27 на 28 жніўня ўпаўнаважылі А.Керанскага на "фарміраванне ўрада, цэнтральнай задачай якога павінна з'яўляцца самая рашучая барацьба са змовай і генералам Карнілавым". Днём 28 жніўня намаганнямі абодвух цэнтраў "рэвалюцыйнай дэмакратыі" быў створаны надзвычайны орган — Камітэт народнай барацьбы з контррэвалюцыяй на чале з В.Н.Філіпоўскім[15].

У сваю чаргу ноччу з 27 на 28 жніўня Л.Карнілаў у тэлеграме, разасланай на адрас "начальніцкіх асоб і дарожных камітэтаў" чыгунак, паведаміў, што ён быў "вымушаны выступіць адкрыта" таму, што Часовы ўрад "пад націскам бальшавіцкай большасці Саветаў дзейнічае ў поўнай згодзе з планамі германскага генеральнага штаба". "Я заяўляю ўсім і кожнаму, — гаварылася ў тэлеграме, — што асабіста мне нічога не патрэбна, акрамя захавання Вялікай Расіі, і клянуся давесці народ шляхам перамогі над ворагам да Устаноўчага сходу, на якім ён сам вырашыць свае лёсы і абярэ ўклад свайго новага жыцця..."[16]. Як бачна, генерал прама не заклікаў да барацьбы супраць урада, а тлумачыў прычыну свайго выступлення. Тым не менш зварот А.Керанскага, адозвы грамадска-палітычных арганізацый, асобных грамадскіх і ўрадавых дзеячаў паказвалі генерала Л.Карнілава як здрадніка, а яго выступленне як імкненне да контррэвалюцыйнага перавароту. Тэлеграмы і адозвы з заклікамі абараніць Часовы ўрад і заваёвы рэвалюцыі былі ўспрыняты масамі ў якасці дырэктыўных установак для далейшай барацьбы супраць контррэвалюцыі. Каб спыніць прасоўванне дывізій А.Крымава і А.Далгарукага на Петраград, 28 жніўня А.Керанскім была разаслана чарговая тэлеграма (яна

адразу ж з'явілася ў друку) кіраўнікам чыгунак і чыгуначным камітэтам. У ёй гаварылася: "Ад імя Часовага ўрада заклікаю ніякіх патрабаванняў і распараджэнняў былога Вярхоўнага Галоўнакамандуючага генерала Карнілава, які здрадзіў радзіме і адкрыта паўстаў супраць Часовага ўрада, не выконваць. Своечасова паклапаціцца выклікам рэвалюцыйных часцей для аховы і абароны ад гвалтаў агентаў генерала Карнілава"[17].

Ва ўмовах палітычнай бязладнасці і слабасці Часовага ўрада звесткі пра дзейнасць Л.Карнілава выклікалі стыхійныя актыўныя выступленні прыхільнікаў дэмакратычных заваёў. У цэнтры ўвагі ўсіх палітычных сіл апынуліся ўзброеныя сілы адначасова як пагроза рэвалюцыі, так і яе выратаванне.

Палітычныя і грамадскія арганізацыі Беларусі, а таксама салдаты франтавых і тылавых часцей у сваёй пераважнай большасці ўспрынялі выступленне Вярхоўнага галоўнакамандуючага як пагрозу рэвалюцыйным заваёвам і неабходнасць падтрымаць Часовы ўрад. Уладныя структуры, урадавыя (камісарыяты) і гарадскія (думы), а таксама грамадска-палітычныя арганізацыі (Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, салдацкія камітэты, прафсаюзы) і партыйныя арганізацыі адгукнуліся на заклікі абараніць рэвалюцыю. Іх уключэнне ў барацьбу за падтрымку Часовага ўрада, абарону рэвалюцыйнага Петраграда і дэмакратыі адбывалася на працягу 4—5 дзён і нават пазней. Так, 28 жніўня, пасля атрымання тэлеграмы А.Керанскага, у буйнейшых гарнізонах і чыгуначных цэнтрах Беларусі прайшлі сходы шырокіх колаў грамадскасці. Адбыліся пасяджэнні Выканаўчага камітэта Заходняга фронту, выканкамаў Саветаў Бабруйска, Барысава, Віцебска, Оршы, Рагачова; агульны сход Саветаў у Гомелі, сумесны сход салдат і насельніцтва ў Друі і інш.

Пачалося фарміраванне антыкарнілаўскіх камітэтаў. Ініцыятарамі стварэння Часовага рэвалюцыйнага камітэта ў Мінску з'яўляліся члены Выкамзаха. У Бабруйску быў арганізаваны Камітэт аховы рэвалюцыі, у Барысаве і Віцебску — Ваенныя бюро, у Гомелі — Камітэт рэвалюцыйнай аховы, у Друі — Камітэт выратавання рэвалюцыі, у Дзісне, Жлобіне, Мазыры, Оршы — Часовыя бюро, у Полацку, Рагачове — Асобыя калегіі, у Рэчыцы — Савет салдацкіх і рабочых дэпутатаў. У склад гэтых органаў увайшлі прадстаўнікі рабочых, салдацкіх і сялянскіх Саветаў (Мінск), левых партый (Бабруйск, Віцебск), гарадскіх дум (Бабруйск, Гомель, Друя, Мінск), урадавыя і ваенныя камісары (Барысаў, Гомель, Мазыр, Мінск). Антыкарнілаўскія камітэты адхілялі ад пасад "ненадзейных" начальнікаў гарнізонаў (Віцебск, Рагачоў) і асобных чыноўнікаў (Друя). Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам П.С.Балуеў і начальнік Дзвінскай ваеннай акругі К.К.Баёў пацвердзілі сваю лаяльнасць Часоваму ўраду[18].

Для забеспячэння грамадскага парадку часова забараняліся масавыя мерапрыемствы (Мінск, Гомель). Для апавяшчэння насельніцтва і салдат аб сутнасці падзей былі створаны спецыяльныя групы агітатараў. Праз мясцовыя газеты жыхары заклікаліся да падтрымання парадку і захавання спакою. Уводзілася цэнзура (Бабруйск, Віцебск, Мінск)[19].

У мэтах барацьбы з прыхільнікамі Л.Карнілава і ізаляцыі Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага на вузлавыя станцыі Мінскай ваеннай акругі былі накіраваны ўпаўнаважаныя ваеннага камісара Заходняга фронту У.В.Жданава з правам нагляду за перасоўваннем войскаў. У Рагачове праверцы падвяргаліся ўсе эшалоны, што праходзілі праз чыгуначную станцыю. У Оршы па ўсіх дарогах і на мосце цераз Дняпро былі выстаўлены заставы з загадам затрымліваць усе падводы і аўтамабілі, якія рухаліся ў напрамку Магілёва. Значную дапамогу ў гэтай справе, а таксама ў падтрыманні сувязі паміж антыкарнілаўскімі сіламі аказваў атрад самакатчыкаў. У Гомелі і Друі забаранялася перасоўванне вайсковых часцей гарнізона без дазволу, падпісанага начальнікам гарнізона і старшынёй антыкарнілаўскага камітэта. Прадстаўнікі Саветаў накіроўваліся ў Магілёў, Жлобін і Гомель для каардынацыі сваіх дзеянняў.

Адзначым, што выступленне Л.Карнілава першапачаткова было падтрымана многімі генераламі. Так, ужо 28 жніўня начальнік штаба Стаўкі генерал А.С.Лукомскі і галоўнакамандуючыя Паўночным (У.Н.Клямбоўскі), Заходнім (П.Балуеў), Паўднёва-Заходнім (А.Дзянікін), Румынскім (Д.Г.Шчарбачоў) франтамі ў сваім звароце да А.Керанскага лічылі рашэнне аб адхіленні Л.Карнілава няправільным і небяспечным для ваеннага часу[20]. Не падпарадкаваўся загаду аб адхіленні ад пасады і сам Л.Карнілаў.

Аднак рэальнай дапамогі ад іх Л.Карнілаў не атрымаў. Генералы засталіся вернымі прысязе, якую далі Часоваму ўраду. Ужо 28 жніўня асноўныя стратэгічныя пункты і аб'екты Дзвінскай і Мінскай ваенных акруг былі ўзяты пад кантроль антыкарнілаўскіх камітэтаў. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал П.Балуеў заверыў у лаяльнасці Часовы ўрад і адначасова звярнуўся да Л.Карнілава з заявай, "у якой ён як стары салдат просіць спыніць цяжкую і пагібельную для Расіі смуту". Генерал задаволіў просьбу Часовага Рэвалюцыйнага камітэта ў Мінску аб высылцы ў яго распараджэнне "вернага дэмакратыі палка", а таксама атрада вайскоўцаў "для службовых патрэб Выкамзаха". На франтах і ў тылавых часцях вялася актыўная агітацыйна-прапагандысцкая работа па згуртаванні салдат і афіцэраў вакол Часовага ўрада і прадухіленні гвалту ў адносінах да камандзіраў. Паступленне карнілаўскіх тэлеграм на перадавую было спынена. Усе магчымыя (за выключэннем радыё) кантакты Стаўкі з часцямі, якія рухаліся на сталіцу, былі перарваны.

29 жніўня адбывалася папаўненне антыкарнілаўскіх камітэтаў новымі прадстаўнікамі дэмакратычных арганізацый. Насельніцтва Бабруйска, Гомеля, Мазыра, Мінска, Оршы апавяшчалася аб стварэнні надзвычайных камітэтаў, іх паўнамоцтвах і заклікалася да захавання парадку. З падобнымі адозвамі выступілі Саветы Барысава, Горак, мястэчка Насові-

чы. Усе друкаваныя органы, незалежна ад палітычнага кірунку і ведамаснай прыналежнасці, публікавалі адозвы ўрада і Саветаў, а таксама рэзалюцыі з асуджэннем Л.Карнілава і ў падтрымку Часовага ўрада. Так, сход салдат Мінскага гарнізона прызнаў выступленне Л.Карнілава здрадай і "пастанавіў лічыць здраднікамі ўсіх, ад генерала да салдата, якія не падпарадкоўваюцца загадам Часовага ўрада"[21].

У Бабруйску з вайсковых часцей гарнізона быў арганізаваны "зводны рэвалюцыйны атрад для падтрымкі рэвалюцыйнага парадку як у горадзе, так і ў наваколлях". Яго ўзначаліў член Выканкама бундавец Н.Б.Левінсон.

У гарадах дзейнічала служба кантролю за грамадскім парадкам і перасоўваннем войскаў. Так, паводле ўказання камісара У.Жданава, члены Выканкама Аршанскага Савета не дазволілі атраду "цекінцаў" (Цекінскі полк уваходзіў у склад "Дзікай" дывізіі. — **М.С.**) у 140 чалавек праехаць на Магілёў і накіравалі яго ў Віцебск. У той жа дзень на закрытым пасяджэнні Савета была абрана вайсковая камісія з 33 чалавек для арганізацыі рэвалюцыйнага атрада з часцей гарнізона. У 18 гадзін у горад прыбыў палкоўнік А.Караткоў, які меў паўнамоцтвы камісара Часовага ўрада і ўзначаліў усю арганізацыйную работу.

Актыўную работу вялі і прыхільнікі генерала Л.Карнілава. У Магілёве, у адпаведнасці з загадам начальніка гарнізона палкоўніка Плюшчык-Плюшчэўскага, было ўведзена асаднае становішча. Забаранялася ўсякая антыкарнілаўская агітацыя, уводзілася ваенная цэнзура.

Ужо 28—29 жніўня ў Магілёве з'явілася мноства адозваў. Цэнтральнае месца займаў плакат з тэлеграмамі чатырох галоўнакамандуючых франтамі на адрас урада аб немэтазгоднасці адхілення Л.Карнілава ад пасады. Распаўсюджваўся і яго загад № 900 ад 29 жніўня, у якім генерал запэўніваў грамадскасць Магілёўскага Савета ў адсутнасці "якіх-небудзь контррэвалюцыйных задум" і сваёй прыхільнасці "заваяваным свабодам".

Ва ўмовах асаднага становішча газета "Молот" была вымушана прыпыніць выхад, але 29 жніўня яе выдаўцы надрукавалі пад грыфам "Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў" асобнай адозвай тэлеграму А.Керанскага з аб'яўленнем Л.Карнілава здраднікам. Пасля гэтай акцыі ўсе чакалі арышту выканаўчага камітэта Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, аднак яго толькі выселілі з памяшкання і ён працягваў дзейнічаць паўлегальна[22]. Нягледзячы на забароны, на чыгуначнай станцыі ў Магілёве прадаваліся асобныя цэнтральныя выданні (кошт іх узрос з 5 да 30—50 капеек за нумар), з якіх "можна было даведацца аб карнілаўскім руху, захадах, якія прымаліся супраць мяцежнікаў, голасе рэвалюцыйнай дэмакратыі Расіі і інш."[23].

У часцях Магілёўскага гарнізона налічвалася прыкладна 5 000 чалавек пяхоты, у тым ліку Ударны і Георгіеўскі батальёны, 12 бронеаўтамабіляў, 4 аэрапланы, некаторыя артылерыйскія часці[24]. Можна меркаваць, што маральна-палітычны настрой гарнізона Магілёва не вызначаўся асаблівым імкненнем абараняць Стаўку. Таму невыпадкова ў горад былі выкліканы польскія часці пад камандаваннем Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага. Аднак трапіць у Магілёў яны не змаглі.

Такім чынам, 29 жніўня пад кантролем антыкарнілаўскіх камітэтаў, за выключэннем Магілёва, заставаліся важнейшыя ваенныя і грамадзянскія аб'екты, чыгуначныя станцыі, вайсковыя часці, друк, ахова парадку. Паміж важнейшымі стратэгічнымі пунктамі (Бабруйск, Віцебск, Гомель, Жлобін, Калінкавічы, Мінск, Орша і інш.) была наладжана тэлефонна-тэлеграфная і жывая сувязь. Камітэты гэтых пунктаў мелі магчымасць звязацца са сталіцай і карэкціраваць сваю дзейнасць у адпаведнасці з распараджэннямі Часовага ўрада і яго камісараў на месцах.

30 жніўня выйшаў экстранны нумар газеты "Фронт" з адозвамі А.Керанскага, ЦВК Саветаў, міністра працы М.І.Скобелева, генерала П.Балуева, камісара У.Жданава і інш. Са зместу публікацый вынікала, што ўвесь расійскі народ і яго армія знаходзяцца на баку Часовага ўрада. У той жа дзень была распаўсюджана радыётэлеграма А.Керанскага з нагоды яго прызначэння Вярхоўным галоўнакамандуючым. У ёй гаварылася: "Вар'яцкая спроба ваеннага мяцяжу былога вярхоўнага галоўнакамандуючага і нікчэмнай кучкі генералаў скончылася поўнай няўдачай, і вінаватыя ў мяцяжы аддаюцца пад ваенна-рэвалюцыйны суд"[25].

Тым не менш барацьба супраць прыхільнікаў Л.Карнілава не спынялася. У Оршы пасажыры цягнікоў падлягалі строгай праверцы, выяўленыя сярод іх "карнілаўцы" арыштоўваліся. Сярод іншых былі арыштаваны супрацоўнік "Нового времени" Ніканораў, які вёз з Магілёва стос адозваў Л.Карнілава, пакеты на адрас "Русского слова", "Дня" і інш., а таксама старшыня "Саюза афіцэраў" палкоўнік Л.Навасільцаў. Яны пад канвоем былі адпраўлены ў Віцебск.

Часовы рэвалюцыйны камітэт у Мінску для прадухілення выхаду контррэвалюцыйных адозваў даручыў гарадскому прафсаюзу друкароў нагляд за друкарнямі, а таксама распарадзіўся аб канфіскацыі нумара газеты "Русское слово", прызнаў яе паведамленні аб бягучых падзеях ілжывымі. На сходзе праўленняў прафсаюзаў г. Мінска было станоўча вырашана пытанне пра стварэнне ўзброеных рабочых дружын на ўзор петраградскай Чырвонай гвардыі.

Камітэты Гомеля і Мазыра актыўна распаўсюджвалі адозвы ЦВК Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў, Петра-градскага Савета, партыйных і дзяржаўных дзеячаў, а таксама накіроўвалі тэлеграмы ў падтрымку Часовага ўрада і асабіста А.Керанскага.

Увечары 30 жніўня ў Оршы пачалася падрыхтоўка да наступлення на Стаўку. Да таго часу "рэвалюцыйны атрад" быў забяспечаны артылерыйскай батарэяй з 8 гармат і ўзводам з 3 гармат. З Віцебска прыбылі гарматная прыслуга і афіцэры, вечарам —

стралковы дывізіён 2-й Кубанскай дывізіі ў колькасці 300 штыкоў і каманда з 10 кулямётамі. Смаленскі і Віцебскі Саветы выслалі падмацаванне ў 1 400 штыкоў з 2 кулямётнымі ротамі. З Мінска прыбылі часці драгунскага палка і інш.[26].

Адначасова актывізавалася антыкарнілаўская дзейнасць і ў Магілёве. Так, на сходзе рабочых дэпо Рыга-Арлоўскай чыгункі была прынята рэзалюцыя аб падтрымцы Часовага ўрада і выпуску адпаведнай адозвы. Мясцовыя арганізацыі аб'яднанай РСДРП і Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў, ПС-Р) у сваіх адозвах да "таварышаў і грамадзян" заклікалі да спакою і згуртавання вакол Саветаў. Эсэры запэўнівалі, што "наш рэвалюцыйны Часовы ўрад на чале з яго высакародным правадыром тав. Керанскім прадухіліць братазабойчую бойню і дасць па заслугах тым, хто асмеліцца замахнуцца на яго законную ўладу". У адозве арганізацыі РСДРП гаварылася: "Як толькі будзе неабходнасць у Вашым выступленні, мы паклічам Вас. Мы не сумняваемся, таварышы, у Вашай рэвалюцыйнай гатоўнасці абараняць Радзіму, Свабоду і Рэвалюцыю ад цёмных замахаў дыктатуры генерала Карнілава"[27].

Рэжым асаднага становішча ў Магілёве не выліўся ў рэпрэсіі супраць мясцовых дэмакратычных сіл. Акрамя рэдкіх арыштаў вайскоўцаў за крытыку Л.Карнілава або за публічна выказаныя сімпатыі да Часовага ўрада нічога істотнага ў гэтым сэнсе не адбылося. Відавочна, што кіраўнікі Стаўкі не імкнуліся да паглыблення канфрантацыі ні з Петраградам, ні з мясцовай грамадскасцю. У сталіцы таксама ўсведамлялі небяспеку ўзброенага сутыкнення для паглыблення крызісу і таму не фарсіравалі сілавы варыянт вырашэння канфлікту. Паездка эмісара Часовага ўрада генерала М.Аляксеева (ён быў прызначаны намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага А.Керанскага) у Стаўку ноччу з 30 на 31 жніўня для перагавораў з Л.Карнілавым аднолькава задавальняла ўсіх зацікаўленых у захаванні грамадзянскага міру і баяздольнасці арміі. У Беларусі толькі віцебскія бальшавікі выказалі сваю нязгоду з такімі дзеяннямі па выхаду з крызісу. Пасля гутаркі з М.Аляксеевым на станцыі "Віцебск" яны вынеслі ўражанне, што генерал "замест шляху барацьбы з контррэвалюцыяй яўна становіцца на шлях згодніцтва з ёй"[28].

У іншых гарадах звесткі пра згоду Л.Карнілава пачаць перагаворы былі ўспрыняты як яго паражэнне. Так, у Бабруйску, Гомелі і Рагачове на пасяджэннях дэмакратычнай грамадскасці заслухоўваліся справаздачы аб дзейнасці антыкарнілаўскіх камітэтаў. У Мінску гласныя гарадской думы ўхвалілі дзейнасць сваіх прадстаўнікоў у Часовым рэвалюцыйным камітэце Заходняга фронту. Члены камітэта на чале са старшынёй А.М.Кажэўнікавым лічылі, што да поўнага вырашэння канфлікту патрэбна захоўваць парадак, не дапускаць правядзення масавых мерапрыемстваў і праяў контррэвалюцыі. У напружаным рэжыме дзейнічаў антыкарнілаўскі камітэт у Мазыры. У Оршы ваенная камісія Савета на чале з палкоўнікам Шабаліным апублікавала распараджэнне аб забароне ў горадзе "ўсякіх вулічных мітынгаў".

У Магілёве ў 18 гадзін 31 жніўня за подпісам "Вярхоўнага галоўнакамандуючага генерала Карнілава" была распаўсюджана чарговая адозва. У ёй гаварылася, што "генерал Аляксееў ідзе з Петраграда ў Магілёў для вядзення са мной ад імя Часовага ўрада перагавораў, якія ўсе мной будуць надрукаваны і расклеены. З'яўляючыся змагаром за Свабоду і парадак у краіне, я застаюся няўхільным у абароне такіх і буду адстойваць іх на працягу ўсяго часу вядзення перагавораў". Перспектыва хуткага паражэння мяцяжу падштурхнула Магілёўскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў да актыўных дзеянняў. Нелегальна ў земскай друкарні былі надрукаваны антыкарнілаўскія адозвы. Ноччу пры іх пераносцы былі арыштаваны 5 членаў Савета. Але, як пісаў пазней адзін з іх — Ц.Акстолкер, — "зусім нечакана нас выпускаюць на свабоду"[29].

У ноч на 1 верасня ваенны камісар Заходняга фронту У.Жданаў прыбыў у Оршу. Перад выступленнем атрада на Магілёў ён праз тэлеграф, тэлефон і радыё скаардынаваў дзеянні Саветаў Оршы, Віцебска, Жлобіна і Бабруйска. Па прамым провадзе палкоўнік А.Караткоў атрымаў загад А.Керанскага аб наступленні. Раніцай 1 верасня зводны атрад наблізіўся да Магілёва і размясціўся за 15 вёрст ад горада. Але ўзброенага сутыкнення не адбылося. Камісар У.Жданаў і генерал М.Аляксееў па прамым провадзе з Оршы звязаліся з Магілёвам і атрымалі згоду на прыезд урадавай дэлегацыі ў Стаўку[30].

1 верасня Стаўка перайшла пад кіраўніцтва генерала М.Аляксеева. У 17 гадзін Бюро выканкама Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў склікала аб'яднанае пасяджэнне прадстаўнікоў салдацкіх камітэтаў, на якім прысутнічалі і дэлегаты карнілаўскага ўдарнага палка. У 19 гадзін магілёўскі гарнізон заявіў аб сваёй падтрымцы Часовага ўрада. У 22 гадзіны генералы Л.Карнілаў, А.Лукомскі, І.П.Раманоўскі і палкоўнік Плюшчык-Плюшчэўскі былі арыштаваны. Іх ахову ўзяў на сябе мясцовы гарнізон з удзелам Георгіеўскага батальёна. З Оршы ў Магілёў выехалі ваенны камісар У.Жданаў, члены Часовага рэвалюцыйнага камітэта, следчая камісія і галоўны ваенна-марскі пракурор І.С.Шаблоўскі. Выканкам Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў разам са створаным Камітэтам рэвалюцыйнай аховы звярнуліся да насельніцтва з заклікам захоўваць спакой, не дапускаць самавольных арыштаў і г. д.[31].

Такім чынам, "карнілаўшчына" скончылася арыштам былога Вярхоўнага галоўнакамандуючага, яго паплечнікаў і прыхільнікаў. "Вымушаны выступіць адкрыта", генерал Л.Карнілаў не здолеў абвергнуць узведзеных на яго абвінавачванняў у здрадзе радзіме, замаху на ўладу Часовага ўрада і інш., трапіў пад асуджэнне ўсёй расійскай грамадскасці.

Ад яго адмежаваліся нават партыі ліберальнай дэмакратыі. Так, яшчэ 28 жніўня ўдзельнікі нарады ЦК партыі "Народнай свабоды" (кадэты) заявілі, што

яны "асуджаюць карнілаўскі рух і лічаць, што Часовы ўрад павінен арганізавацца такім чынам, каб прадухіліць магчымасць новых бедстваў для Расіі і быць свабодным ад пабочных уплываў". 29 жніўня віцебскі губернскі камісар кадэт А.Валковіч запатрабаваў у служачых "падпіску аб вернасці Часоваму ўраду".

Цень абвінавачвання ў "здрадзе радзіме" быў кінуты не толькі на генералаў і афіцэраў, якія знаходзіліся ў Стаўцы ў Магілёве, але і на ўсіх вайскоўцаў, хто ўдзельнічаў у паходзе на Петраград, між тым як асноўная іх маса проста выконвала загады камандзіраў. Пасля кантактаў з агітатарамі яны аб'яўлялі сябе прыхільнікамі Часовага ўрада. Рэдкія выпадкі адкрытай агітацыі за Л.Карнілава заканчваліся арыштамі агітатараў. Усяго ў Беларусі было арыштавана не больш за 50 "карнілаўцаў". Сярод іх быў уладальнік маёнтка ў Лепельскім павеце 70-гадовы сенатар Рымскі-Корсакаў, які па тэлеграфу паведаміў аб тым, што моліць бога дапамагчы Л.Карнілаву "выратаваць Расію" і аддае сябе ў яго распараджэнне. Праз месяц турэмнага зняволення ў Віцебску высветлілася, "што да справы генерала Карнілава ён ніякага дачынення не мае".

Большасць антыкарнілаўскіх камітэтаў не атаясамлівалі "карнілаўцаў" з усімі генераламі і афіцэрамі, дзейнічалі з улікам неабходнасці захавання баяздольнасці фронту. Паводле слоў палкоўніка А.Караткова, "мяцеж быў падаўлены без праліцця хоць бы адзінай кроплі крыві... Гэтага патрэбна было, па магчымасці, пазбягаць, бо на кожны стрэл у Магілёве фронт адказаў бы мільёнамі стрэлаў, накіра ваных у афіцэрства; здарылася б вялікае зло, армія засталася б без каманднага саставу"[32].

Калі ў прыфрантавой Беларусі канфлікт вырашыўся без кровапраліцця, то гэтага нельга сказаць пра сталічны рэгіён, дзе атрады "рэвалюцыйнай дэмакратыі" толькі па падазрэнні ў сувязях з Л.Карнілавым забілі шмат афіцэраў у Выбаргу, Гельсінгфорсе, на крэйсеры "Петрапаўлаўск".

Характэрна, што генералы і афіцэры, якія былі ў Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве, не выказвалі агрэсіўных намераў, што зусім не стасуецца са створаным для іх іміджам "мяцежнікаў" і "контррэвалюцыянераў". Сам генерал Л.Карнілаў, апынуўшыся ў ваеннай, палітычнай і інфармацыйнай ізаляцыі, не выкарыстоўваў сілавых захадаў у барацьбе супраць аб'яднаных сіл Часовага ўрада і грамадска-палітычных арганізацый. Як патрыёт і прафесійны ваенны, ён найперш клапаціўся пра захаванне баяздольнасці арміі, таму ўрэшце і пагадзіўся на мірныя перагаворы з прадстаўнікамі ўрада, што звяло вынікі канфлікту да мінімуму.

Уяўленне пра падзеі канца жніўня—пачатку верасня 1917 г. у грамадскасці Беларусі і салдат Заходняга фронту склалася на аснове іх ацэнак А.Керанскім, міністрамі ўрада, лідэрамі ЦВК Савета і інш. Вызначэнні накшталт "карнілаўшчына — здрада радзіме", "контррэвалюцыя" і інш., якія ў той час з'явіліся на старонках левых газет, у прамовах аратараў, адозвах Саветаў і антыкарнілаўскіх камітэтаў, адразу паўплывалі на фарміраванне негатыўнай грамадскай думкі (асабліва ў дэмакратычных колах) у дачыненні да Л.Карнілава і яго выступлення. Тым не менш масавага выказвання сваіх сімпатый і антыпатый у гэтай сувязі не назіралася. Антыкарнілаўскія камітэты прыклалі шмат намаганняў, каб падобных выступленняў, нават адкрытых мітынгаў не адбылося. Гарадское насельніцтва ў гэтых камітэтах удзельнічала праз прадстаўніцтва ад Саветаў і самакіраванняў. У некаторых месцах, напрыклад, у Мінску, пачалі стварацца атрады рабочых, але іх прызначэнне ва ўмовах узнікшай небяспекі пагромаў было скіравана не на барацьбу з "карнілаўцамі", а на самаабарону.

З 27 па 30 жніўня ў розных рэгіёнах Расіі было створана больш за 240 антыкарнілаўскіх камітэтаў[33], з іх у Беларусі толькі каля 15. Яны былі арганізаваны нават не ва ўсіх павятовых гарадах. Прычыны таму розныя — ад слабасці мясцовых грамадска-палітычных арганізацый у гэтых месцах да недастатковага інфармацыйнага забеспячэння. У кожным з населеных пунктаў, дзе грамадскасць разам з уладнымі структурамі выявіла імкненне да барацьбы з мяцежнікамі, меліся свае асаблівасці ў складзе ўдзельнікаў, плана дзеянняў, усталявання кантактаў з іншымі камітэтамі і г. д. Што датычыць большай часткі беларускіх сялян, то іх адносіны да падзей, нават калі звесткі пра гэта і траплялі ў вёску, характарызаваліся поўнай абыякавасцю.

Асобнай гаворкі заслугоўвае роля бальшавікоў Беларусі ў "карнілаўскіх" падзеях. Як вынікае з манаграфіі Л.С.Гапоненкі, нібыта "па ініцыятыве Мінскага камітэта бальшавікоў быў створаны Часовы рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, а таксама штаб рэвалюцыйных войскаў Мінскага раёна. Начальнікам штаба рэвалюцыйных войскаў стаў М.В.Фрунзе"[34]. Такія ж беспадстаўныя звесткі, а таксама гіпербалізаваныя ацэнкі ўкладу бальшавікоў Беларусі ў ліквідацыю мяцяжу ўтрымліваюцца і ў сучаснай літаратуры[35].

Зазначым, што партыйная прыналежнасць пры стварэнні антыкарнілаўскіх камітэтаў пад увагу не бралася. Барацьба з мяцежнікамі адсунула на другі план ідэйныя разыходжанні і аб'яднала ўсіх, хто лічыў найважнейшымі ідэалы дэмакратыі, у тым ліку і неабходнасць абароны "рэвалюцыйнага Часовага ўрада". Выкарыстанне партыйных лозунгаў у гэтай барацьбе не насіла прыкмет адасобленасці той ці іншай партыі ад агульнага руху. Нават пракламацыі, што нелегальна выпускаліся магілёўскімі эсэрамі і сацыял-дэмакратамі, не мелі нейкіх вузкапартыйных мэт, як не мелі іх бальшавікі, якія бралі ўдзел у агульнай барацьбе. Пераважная большасць у камітэтах членаў ПС-Р, РСДРП, Бунда адлюстравала аб'ектыўную карціну іх ролі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі.

Савецкая і сучасная гістарыяграфія ўтрымлівае грунтоўныя звесткі пра наступствы ліквідацыі "карнілаўшчыны", акцэнтуючы ўвагу галоўным чынам на

крызісе "згодніцтва", бальшавізацыі Саветаў, далейшым паглыбленні палітычных і сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей у краіне і г. д. У той жа час там не зафіксавана, што ў ходзе барацьбы супраць Л.Карнілава афіцэрскі корпус быў канчаткова дыскрэдытаваны і пазбаўлены выканання сваіх прамых функцый. Пад уздзеяннем бальшавікоў, левых эсэраў, анархістаў і інш. дзейнасць узброеных сіл стала скіроўвацца не супраць знешняга ворага, а супраць "унутранай контррэвалюцыі", увасабленнем якой выступаліся буржуазія і ўсё тыя ж "карнілаўцы". Зразумела, што неўзабаве ў іх асяроддзі апынуліся "правадыр рэвалюцыі" А.Керанскі і ўсе астатнія прадстаўнікі "рэвалюцыйнай дэмакратыі", хто за прывідам "генерала на белым кані" не ўбачыў пагрозы рэальнай дыктатуры адной партыі.

---

[1] Иоффе Г.З. «Белое дело». Генерал Корнилов. М., 1989. С. 151; Деникин А.И. Очерки русской смуты: Крушение власти и армии, февр. — сент. 1917 г. М., 1991.

[2] Смольянинов М.М. Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. Мн., 1991. С. 251; Калаткоў У.Я. Карнілаў Лаўр Георгіевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 8. Мн., 1999. С. 82.

[3] Катков Г. Февральская революция. М., 1997. С. 329.

[4] Минский голос. 1917, 4—5 марта; Витебский вестник. 1917, 5 марта.

[5] Деникин А.И. Очерки русской смуты: Крушение власти и армии, февр. — сент. 1917 г. С. 22.

[6] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Фонд 60, воп. 3, спр. 242, арк. 45—46.

[7] Семанов С.Н. Брусилов. М., 1980. С. 259.

[8] Новое время. 1917, 13 июня.

[9] Великий Октябрь и защита его завоеваний. Победа социалистической революции. М., 1987. С. 70.

[10] Семанов С.Н. Брусилов. С. 276.

[11] Смольянинов М.М. Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. С. 163.

[12] Иоффе Г.З. «Белое дело». Генерал Корнилов. С. 160.

[13] НАРБ. Ф. 35, воп. 1, спр. 2, арк. 87.

[14] Рабинович А. Большевики приходят к власти: Революция 1917 года в Петрограде: Пер. с англ. М., 1989; Иоффе Г.З. «Белое дело». Генерал Корнилов. С. 107; Злоказов Г.И. Меньшевистско-эсеровский ВЦИК Советов в 1917 году. М., 1997. С. 204; Витебский листок. 1917, 30 августа.

[15] Рабинович А. Большевики приходят к власти: Революция 1917 года в Петрограде. С. 148; Злоказов Г.И. Меньшевистско-эсеровский ВЦИК Советов в 1917 году. С. 214—215.

[16] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 2625, воп. 4, спр. 2, арк. 649—650.

[17] Рабочая мысль. 1917, 29 августа.

[18] Новое Варшавское утро. 1917, 31 августа; Бобруйский курьер. 1917, 6 сентября; НГАБ. Ф. 23, воп. 1, спр. 36, арк. 51; Витебский листок. 1917, 30 августа; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 148, арк. 34; Известия Гомельского Совета. 1917, 29 сентября; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 158, арк. 20; Наше свободное слово. 1917, 31 августа, 7 сентября; Известия Мозырского Совета. 1917, 30 августа; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 208, арк. 12; Витебский листок. 1917, 5 сентября; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 164, арк. 159; Известия Гомельского Губернского комитета РКП(б). 1921. №27. С. 33.

[19] Фонды Дзяржаўнага музея гісторыі і культуры Беларусі. Інв № 3924; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 148, арк. 34; Бобруйский курьер. 1917, 6 сентября; Витебский листок. 1917, 30 августа; Новое Варшавское утро. 1917, 31 августа; НГАБ. Ф. 24, воп. 1, спр. 3663, арк. 1.

[20] НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 164, арк. 158—159; Рабинович А. Большевики приходят к власти: Революция 1917 года в Петрограде. С. 152

[21] Воля народа. 1917, 29—30 августа; НГАБ. Ф. 23, воп. 1, спр. 36, арк. 51; Свободное слово. 1917, 30 августа; Известия Гомельского губернского комитета РКП (б). 1924. № 79. С. 45.

[22] Известия Бобруйского Совета. 1917, 2—3 сентября; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 166, арк. 12; Могилевская жизнь. 1917, 2 сентября; Молот. 1917, 4, 12 сентября.

[23] Могилевская жизнь. 1917, 5 сентября.

[24] Воля народа. 1917, 3 сентября.

[25] Известия Мозырского Совета. 1917, 31 августа.

[26] Известия Мозырского Совета. 1917, 3 сентября; Оршанский вестник. 1917, 31 августа, 7 сентября; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 160, арк. 12; спр. 190, арк, 66; воп. 4, спр. 107, арк. 12; НГАБ. Ф. 24, воп. 1, спр. 3663, арк. 1; Новое Варшавское утро. 1917, 31 августа; Минская газета. 1917, 1 сентября.

[27] НГАБ. Ф. 3307, воп. 1, спр. 1, арк. 34.

[28] НГАБ. Ф. 3307, воп. 1, спр. 1, арк. 16, 30, 33, 63; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 147, арк. 28—29.

[29] Известия Гомельского губернского комитета РКП(б). 1921. № 28. С. 43.

[30] Новое Варшавское утро. 1917, 31 августа; Известия Мозырского Совета. 1917, 1 сентября; НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 160, арк. 14; спр. 243, арк. 380; Могилевская жизнь. 1917, 2 сентября; Известия Гомельского Губернского комитета РКП(б). 1921. № 28. С. 44; День. 1917, 3 сентября; Воля народа. 1917, 3 сентября.

[31] Молот. 1917,4 сентября; Воля народа. 1917, 2—3 сентября.

[32] Бобруйский курьер. 1917, 31 августа; Витебский листок. 1917, 31 августа, 5 сентября, 6 октября; Воля народа. 1917, 31 августа; Оршанский вестник. 1917, 8 сентября.

[33] Рабинович А. Большевики приходят к власти: Революция 1917 года в Петрограде. С. 164, 171.

[34] Гапоненко Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917). М., 1953. С. 68.

[35] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мн., 1995. С. 14; Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г.—1997 г.: Вучэб. дапам. Мн., 1998. С. 15.; Ігнаценка І. М. Лютаўская рэвалюцыя 1917 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мн., 1997. С. 419; Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. XIX—XX стст.: Курс лекцый. Мн., 2002. С. 259.